# ПЕДАГОГІКА, ПСІХАЛОГІЯ, МЕТОДЫКА

УДК 811.161.3

## ФОТАЗДЫМАК ЯК ТЭКСТ У СУЧАСНЫМ ШКОЛЬНЫМ АДУКАЦЫЙНЫМ АСЯРОДДЗІ

**Л. С. Васюковіч**
доктар педагагічных навук, дацэнт
Віцебскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО»

*Фотаздымак даследуецца аўтарам у кантэксце сучаснага фармату тэкстаў, што выступаюць базай для фарміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў. Бытаванне фатаграфій, іншых малафарматных тэкстаў у сённяшнім адукацыйным асяроддзі дэманструюць спробу выйсці за межы вербальных канонаў прадстаўлення інфармацыі.*

*Фотаздымак уяўляе сабой не разгорнутае паведамленне, а толькі аснову для дыялогу. Фота становіцца апорай для разважанняў, інтэрпрэтацый, успамінаў, паўнацэннай камунікацыі субяседнікаў.*

**Ключавыя словы:** фотаздымак як тэкст, фотаздымак як культурны знак, фота як кампанент адукацыйнага працэсу.

### Уводзіны

Асаблівасці сучаснага адукацыйнага асяроддзя патрабуюць абнаўлення лінгваметадычных падыходаў ва ўмовах тэкстаарыентаваных тэхналогій. Практыка сённяшніх адукацыйных рэалій найперш звязана з новымі фарматамі тэкстаў, што прымяняюцца для фарміравання сацыяльна-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў. Паўсядзённыя зносіны рэпрэзентуюцца featuresрознафарматнымі тэкстамі: шыльды-назвы, рэжым працы магазінаў, кафэ, пошты, паліклінік, кінатэатраў, розных афіцыйных устаноў, паказальнікі геаграфічных назваў, імён, інфармацыйных крыніц, інфармацыйныя табло, таблічкі з назвамі вуліц, плошчаў, знакі, што дазваляюць/забараняюць пэўныя дзеяннні, аб'явы, рэклама і інш. Развіццё тэкстаў новай прыроды – спроба адшукаць альтэрнатыву славеснаму навучанню. На думку вучоных, тэксты новай прыроды дэманструюць «замену ўлады тэксту на ўладу вобраза» [1, с. 36].

Жанр фотаздымка, які доўгі час быў прадметам увагі прафесіяналаў-фатографаў, перажывае своеасаблівы «рэнесанс» у плане цікавасці прадстаўнікоў розных галін навукі. Так, псіхолагі даследуюць механізмы ўспрымання партрэтнай фатаграфіі, якая выступае своеасаблівым каналам невербальнай інфармацыі. «Расчытаная» на фатаграфіях інфармацыя суадносіцца з асобаснымі характарыстыкамі і эмацыянальным станам чалавека, перададзеным на здымку. Распазнаванне эмоцый па міміцы, рэканструкцыя пачуццяў, класіфікацыя базавых экспрэсій становяцца прадметам увагі сучасных вучоных (Т. Ф. Базылевіч, У. А. Барабаншчыкаў, А. У. Жагала, І. М. Майніна і інш.).

### Асноўная частка

У працах філосафаў (Р. Барт, С. Зонтаг, Э. Кранк, А. Пятроўская, В. Саўчук, В. Сцігнееў, У. Эко і інш.) фотаздымак аналізуецца як мадэль аб'ектыўнага свету, сканструяванага сродкамі фатаграфічнага кода ў часе і прасторы. На думку Р. Барта, фатаграфія – культурная з'ява, «нішто іншае, як след, пакінуты рытуалам сацыяльнай інтэграцыі» [2, с. 16]. Паводле меркавання С. Зонтаг, «калекцыянаваць фотаздымкі – значыць калекцыянаваць свет… Фатаграфічны вобраз – не столькі выказванне пра свет, колькі яго частка, мініяцюра рэальнасці» [3, с. 12-13]. У працах філосафаў фотаздымак вылучаецца як культурны феномен,

© Васюковіч Л. С., 2024

унікальны сродак адлюстравання свету і чалавека, які стварае своеасаблівую «ідэалогію» працэсу фатаграфавання.

У вывучэнні фотаздымкаў у сучаснай гістарычнай навуцы адбыўся «мемарыяльны паварот». Фотаздымак, выконваючы разнастайныя функцыі, з'яўляецца дакументальным сведчаннем, кампанентам гістарычнага кантэксту, культуры, жыццядзейнасці асобы. Фатаграфіі, суправаджаючы прыватнае жыццё чалавека, яго біяграфічныя «контрапункты», праз пэўны час выходзяць з індывідуальнай сферы бытавання і становяцца прадстаўніком свайго часу, мастацкім вобразам, люструючы «момант гістарычнай ісціны». Найбольш цікавымі даследаваннямі фатаграфіі ў беларускай культуры з'яўляюцца працы С. У. Грунтова, у якіх фотаздымкі сталі аб'ектам навуковай увагі. Работы вучонага дэманструюць фатаграфію як складаную і шматмерную з'яву, якая можа паўнацэнна вывучацца толькі ў кантэксце бытавання, камунікацыі.

Значныя набыткі ў вывучэнні фотаздымкаў маюць сацыёлагі, культуролагі, журналісты, гісторыкі моды. У беларускамоўнай прасторы даследаванняў вылучаюцца грунтоўнасцю працы В. А. Лабачэўскай, Н. І. Саўчанкі, А. М. Вялічкі і інш. Так, дзейнасць Аляксандра Міхайлавіча Вялічкі вяртае з небыцця шматлікія імёны майстроў фатаграфічнай справы на працягу 1850–1918 гадоў. Напрыклад, толькі пералік прозвішчаў у выданні «Фатографы зямлі беларускай» займае пятнаццаць старонак. На фоне страты фатаграфіі як культурнай з'явы абвастраецца цікавасць да выявы як сведкі гістарычнага мінулага. У кантэксце сэлфі, якія запаўняюць сучасны Інтэрнэт, узрастае цяга да «старой» фатаграфіі, якая становіцца гістарычным шэдэўрам «светапіснага класічнага мастацтва і антыкварным прадметам калекцыянавання» [4, с. 112].

На сённяшні дзень некаторыя вучоныя прапануюць наогул разглядаць візуальнасць (як і віртуальнасць) стрыжнем сучаснай культуры (Н. Крывашэін, С. Няхаеў, Я. Яскевіч і інш.). На думку даследчыкаў, візуальны вобраз больш выйгрышны, чым слова, паколькі ён інфармацыйна насычаны. Апроч гэтага, вобраз з'яўляецца эфектыўным інструментам уздзеяння. Лічыцца, што візуальныя вобразы эмацыянальна адлюстроўваюць рэчаіснасць. Візуальны вобраз пераважае над вербальным і па той прычыне, што для яго не існуе моўных бар'ераў. Тэхналогіі XXI стагоддзя, заснаваныя на візуальных формах перадачы ведаў, ствараюць прастору, у якой вобразна-візуальнае мысленне прэтэндуе на прыярытэтную ролю (С. В. Іванова, А. А. Рэан, С. Ю. Сцяпанаў і інш.). Фотаздымак выступае візуальным сродкам, здольным перадаваць паведамленне, удзельнічаць у камунікацыі (як і малюнак, дыяграма, відэаролік). Фотаздымак уяўляе сабой не гатовае паведамленне, а толькі аснову для яго, што патрабуе славеснага суправаджэння. Вербальны каментарый да фотаздымкаў дапаўняе камунікацыю, робіць яе лагічнай у пэўнай маўленчай сітуацыі.

У плынным, хуткабежным часе змяняецца і роля фотаздымкаў. Па сведчанні С. У. Грунтова, «фотаздымкі не так даўно былі часткай матэрыяльнага свету кожнай сям'і, дапамагалі захаваць памяць пра вялікую сям'ю, пра сумеснасць пражывання ў адным доме; пра святы і ўрачыстасці, якія раз за разам аб'ядноўвалі блізкіх, давалі ім нагоду сабрацца разам, каб абмеркаваць навіны, узнавіць падзеі мінулага, наноў паўтараючы і пераказваючы іх» [5, с. 24].

Вялікая заслуга ў развіцці фатаграфіі тых, хто прафесійна ўспрымае фотаздымак як факт мастацтва. Так, дзякуючы намаганням прафесіяналаў у айчынную фатаграфіку вярнулася спадчына беларускага этнографа Ісаака Абрамавіча Сербава (1871–1943), якая захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта і складаецца з 442 арыгінальных фотаздымкаў з подпісамі аўтара. На думку навукоўцаў, «цяжка пераацаніць зробленыя І. Сербавым фотаздымкі. Гэта тытанічная праца, якую можна без перабольшання назваць навуковым і грамадзянскім подзвігам… Усе фотаздымкі – найкаштоўны і найцікавы іканаграфічны матэрыял аб жыцці і побыце беларускіх сялян у першым дзесяцігоддзі XX стагоддзя» [6, с. 49].

Выявы беларускай мінуўшчыны, якія І. Сербаў здолеў увасобіць на фотаздымках у пачатку XX стагоддзя, вярнуліся на Радзіму больш чым праз сто гадоў як найкаштоўнейшыя

візуальныя дакументы. Як зазначае Вольга Лабачэўская, «гісторыя фатаграфіі Беларусі, у тым ліку Палесся, чакае свайго грунтоўнага даследавання. Безумоўна, імя Ісаака Абрамавіча Сербава будзе запісана ў шэраг яе пачынальнікаў… Выданне альбома фотаздымкаў Віленскай калекцыі – даніна светлай памяці І. А. Сербава, яго патрыятызму і прафесіяналізму як навукоўца і фатографа» [7, с. 37].

Узнаўляе гісторыю беларускай фатаграфіі грунтоўнае выданне Надзеі Іванаўны Саўчанкі, якое прадстаўляе творчую спадчыну знакамітага фатографа Савы Уладзіміравіча Сіўко. Н. І. Саўчанка адшукала ўцалелы архіў фотанегатываў, якi захоўваецца сёння ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Альбом-каталог з'яўляецца скарбніцай візуальнай інфармацыі пра штодзённае жыццё беларусаў-«заходнікаў» у складаную эпоху перамен – 20–60-я гады XX стагоддзя [8, с. 12]. Сава Уладзіміравіч Сіўко з 1930 па 1960 год працаваў фатографам, з любоўю здымаў жыхароў мястэчка Любча і вёсак на Навагрудчыне.

Безумоўна, фатаграфія не застаецца нязменнай на працягу стагоддзяў. Першапачаткова яна ўзнікла як факт мастацкага бачання жыцця, даступнага не кожнаму. Што да сучаснага этапу развіцця фатаграфічнага майстэрства, то ў ім, на думку спецыялістаў (В. Ю. Байцова, С. У. Грунтоў, В. А. Лабачэўская і інш.), аб'ядноўваюцца дзве супрацьлеглыя тэндэнцыі. Адна з іх скіравана на фотаздымак як тэкст культуры, што выяўляе нацыянальны культурны код (найперш праз «старыя» фатаграфіі). Другая тэндэнцыя адлюстроўвае тэмпы і рытмы асваення штодзённага жыцця праз сэлфі.

Адзначым: новая форма сучаснай візуальнасці – сэлфі – не з'яўляецца мастацкім партрэтам або фотаздымкам-шэдэўрам. Гэта імгненны «зрэз жыцця». Можна з лёгкасцю адмахнуцца ад з'явы, назваўшы гэта модным захапленнем сучаснай моладзі. Аднак, на думку аўтарытэтных вучоных, «культура ёсць тэкст з многімі пластамі значэнняў» (В. М. Ярская-Смірнова), што азначае: сэлфі патрабуе прачытання, разумення, а не строгіх дэфініцый, іерархіі, класіфікацый і ацэнак у культуры кіч. Паводле пазіцыі даследчыкаў, сэлфі як кампанент масавай культуры, форма візуальнай самапрэзентацыі – абсалютна новы напрамак у фатаграфіі, гэта своеасаблівы спосаб самавыяўлення (О. Гант, Р. Данілаў, В. М. Ярская-Смірнова і інш.). Гэта частка сучаснага мыслення моладзі, праяўленне візуальнасці, выражэнне свайго «Я». Зразумела, гэта не ёсць культура ў высокім сэнсе слова, аднак, улічваючы масавы характар з'явы, яе нельга ігнараваць, трэба лічыцца з ёй як індыкатарам сучаснага жыцця. На фоне імкнення аўтараў сэлфі самасцвярджацца за кошт статусных атрыбутаў, модных аксесуараў – варта прызнаць, што сучаснай моладзі (пэўнай яе часткі) не хапае кантэксту рэалізацыі, асэнсаванасці свайго прызначэння, уласнай чалавечай місіі. Можна не прызнаваць за сэлфі праяўленне культуры паўсядзённасці, аднак адмаўляць прысутнасць гэтай з'явы ў моладзевым асяроддзі не выпадае. Немагчыма праігнараваць, закрэсліць гэтую з'яву, апрыёры наклеіць на яе ярлык няправільнасці.

Прапанаваны матэрыял можа паслужыць тэарэтычнай базай для сістэмы заданняў, арыентаваных на асэнсаванне фотаздымкаў як тыпу тэксту.

1. Пагартайце ваш сямейны альбом. Выберыце фатаграфіі бабулі/дзядулі, калі яны былі яшчэ зусім маладымі (можа, захавалася вясельнае фота). Даведайцеся, калі была зроблена фатаграфія, з якой нагоды. Калі няма магчымасці распытаць бабулю/дзядулю, пагаварыце на гэтую тэму з бацькамі. Які характар блізкіх людзей выяўляецца праз здымак? У чым падобны вы з найбліжэйшымі сваякамі? Знешнасцю? Характарам? Жыццёвай філасофіяй? Падрыхтуйце прэзентацыю «Гісторыя маёй сям'і ў фотаздымках»/«Сямейны альбом як гісторыя майго роду».

2. «*Замяніць сэлфі*». Папрасіце чалавека, якога вы любіце, паважаеце, каму давяраеце, хто ведае вас даўно, пабыць вашым добрым люстэркам і напісаць вам (не сказаць, а зафіксаваць на прыгожай паштоўцы – можна такое пасланне адаслаць з камп'ютара, каб быў час падумаць, асэнсаваць), што яго ў вас захапляе. У чым, на яго погляд, заключаецца ваша індывідуальнасць, прызначэнне, ваша духоўная сіла, ваш дар?

Потым абавязкова самі падпішыце такую паштоўку для лепшых сяброў. Галоўнае, каб гэта былі словы падтрымкі і любові.

*Сэнс задання*: адчуць сябе чалавекам, якога паважаюць, падтрымліваюць. Зразумець, што ў вашых сябрах-люстэрках адбіваецца ваша сапраўднае «Я» – чалавека, вартага павагі і любові.

3. Пазнаёмцеся з выданнем «Беларусы ў фотаздымках» Ісаака Сербава. 1911–1912 / складальнік, аўтар уступнага артыкула Вольга Лабачэўская (Мінск, 2012) [9]. Ацаніце культурную каштоўнасць кнігі ў кантэксце прадмовы да яе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Шаноўныя сябры!

Імклівы час змяніў аблічча беларускіх гарадоў і вёсак, уклад жыцця іх жыхароў, таму фатаграфічная спадчына, якая змешчана ў гэтай кнізе, з'яўляецца сёння надзвычай каштоўнай. Праз яе мы маем магчымасць пазнаёміцца з асаблівасцямі побыту, адзення, народнага дойлідства і прылад працы беларусаў пачатку мінулага стагоддзя.

Гартаючы старонку за старонкай, міжволі нагадваеш, якія істотныя выпрабаванні вызначыў лёс нашым дзядам і прадзедам.

Угледзімся ў твары на фотаздымках – такія знаёмыя, блізкія, родныя, і ў той жа час такія далёкія. Цягавітыя мужчыны, сціплыя прыгожыя жанчыны і, канешне, дзеці, якіх у кожнай сям'і было шмат. Гэтыя людзі выклікаюць павагу сваёй працавітасцю, памяркоўнасцю, гасціннасцю і шчодрасцю – рысамі, што заўсёды былі ўласцівы беларусам.

Ні адзін народ, ні адна краіна не могуць існаваць без жывой сувязі пакаленняў. І нашым сучаснікам надзвычай важна ўсвядоміць уласныя карані, каб рухацца наперад і несці ў свет вечныя ідэалы сардэчнасці, шчырасці і спагады.

Ведаць і памятаць гісторыю сваёй Радзімы, шанаваць сваіх продкаў і спадчыну, якую яны нам пакінулі, – гэта значыць быць духоўным чалавекам у самым высокім сэнсе, гэта значыць быць *беларусам!*

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка

4. Прааналізуйце матэрыялы праекта «Бачу Беларусь такой» («Зачараваны Беларуссю» / фота У. С. Цыдзік, уклад. А. А. Стэльмах (Мінск, 2017); «Зачараваны Беларуссю» / фота У. С. Цыдзік, уклад. А. А. Стэльмах (Мінск, 2018); «Мая Радзіма» / фота Я. В. Пясецкі, У. С. Цыдзік, уклад. А. А. Стэльмах (Мінск, 2019). Мэта праекта – арганізацыя фотавыстаў, выданне фотаальбомаў, правядзенне конкурсаў. На думку арганізатараў, «важна, якой бачыцца, як успрымаецца сучасная Беларусь. Важна, каб паміж старэйшым пакаленнем і моладдзю, якой будаваць будучыню, была пераемнасць у гістарычнай памяці, жыццёвай мудрасці, традыцыях» [10, с. 332].

Як фотаматэрыялы зборніка фарміруюць імідж Беларусі ў свеце, прываблiваюць турыстаў (сваіх і замежных), дапамагаюць спазнаваць сапраўдную Беларусь, выклікаць пачуццё гонару за родную зямлю? Як гармонія двух відаў мастацтва – фатаграфічнага і паэтычнага – узмацняе псіхалагічнае ўспрыманне фатаграфій?

Арганізуйце ў школе/класе фотавыставу «Бачу сваю школу/малую Радзіму такой». Улічыце вопыт правядзення названых фотаконкурсаў, наладжаных Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі. Ацаніце якасць і арыгінальнасць лепшых фотаздымкаў. Ці згодны вы з арганізатарамі конкурсу, што гэтыя фотаздымкі – «своеасаблівы напамін пра гарады, вуліцы, невялікія дворыкі, вёскі, пра тую малую Радзіму, той кавалачак зямлі, адкуль мы родам, з сукупнасці якіх і складаецца самабытнасць беларускага народа» [10, с. 330].

5. Напішыце апавяданне з элементамі разважання на тэму «Гісторыя аднаго фотаздымка». Для гэтага выберыце з сямейнага альбома фатаграфію сваяка незвычайнага ці, наадварот, самага звычайнага лёсу. Таго, кім ганарыцца ваша сям'я, на кім трымаецца ваш радавод, памяць пра каго перадаецца ў вашай сям'і з пакалення ў пакаленне. Ці згодны вы з высновай «Карані нашага сямейнага дрэва глыбокія, вытрымліваюць любы вецер. Калі ёсць памяць, павага да іх – не страшна прадаўжаць род».

6. *Ці любіце вы рабіць сэлфі? Выкажыце свае адносіны да гэтага масавага захаплення моладзі. Што гэта, на вашу думку: вясёлая гульня-забаўка, форма пазіцыянавання сябе або даніна модзе? Прыдумайце ідэю для сэлфі з беларускамоўным слоганам, прысвечаным беларускай культуры.*

7. *Стварыце фотарад сваёй любімай бібліятэкі.* Уключыце, апроч сучасных, здымкі, якія згадваюць гісторыю ўстановы, супрацоўнікаў і чытачоў. Разгарніце з дапамогай фота гісторыю, сучаснасць і будучыню бібліятэкі праз прызму ўласнага бачання. Адлюструйце на здымках кніжны фонд, любімыя кнігі і часопісы, тыя мерапрыемствы, што праводзіліся на базе бібліятэкі. Пры магчымасці прадэманструйце ў фотаработах кнігі бібліятэкі з дарчымі подпісамі ўдзячных чытачоў. Правядзіце конкурс на лепшую назву фотаработ удзельнікаў. Распрацуйце уласны праект.

8. Падрыхтуйце выказванне (прэзентацыю) на тэму «Фотапартрэт маладога пакалення ў сучасных СМІ» (напрыклад, на матэрыяле газеты «Літаратура і мастацтва») [11]. Прааналізуйце фатаграфічнае афармленне газеты за апошнія тры-чатыры месяцы. Выпішыце назвы публікацый, якія суправаджаюцца здымкамі. Якая тэматыка, напрамкі жыццядзейнасці зафіксаваны ў фотадакументах? Якая сэнсавая сувязь прасочваецца паміж загалоўкам, тэмай і фотаздымкам? Якія спосабы ўключэння подпісу да фотаздымкаў выкарыстоўваюцца (унізе, уверсе фотаздымка, у тэксце і інш.)? Якую ролю сярод фатаграфій займае партрэтны/сюжэтны жанр? Якія фатаграфіі пераважаюць – індывідуальныя/групавыя? У якіх абставінах найчасцей дэманструюцца героі фотаздымкаў (на рабочым месцы, у прафесійным акружэнні, у сямейным асяроддзі, у вольны час і інш.)? Прадстаўнікі якой прафесіі адлюстроўваюцца на фотаздымках? З чым гэта, на вашу думку, звязана? Прадстаўнікі якой прафесіі, па вашым меркаванні, абдзелены ўвагай журналістаў? Якія парады вы сфармулюеце калектыву рэдакцыі з мэтай пашырыць аўдыторыю маладых чытачоў?

**Заключэнне**

Такім чынам, фотаздымак уяўляе сабой цэласны тэкст, стварае адзінае сэнсава-функцыянальнае цэлае ў камунікатыўным полі. Нягледзячы на тое, што фатаграфія толькі аснова для камунікатыўных зносін, яна неабходны складнік гэтага працэсу. Фота – шматфункцыянальны кампанент камунікатыўнай прасторы, які шматаспектна раскрывае адлюстраваную падзею, з'яву, факт. Фотаздымак выступае і як памяць пра мінулае, як факт мастацкай версіі рэальнага жыцця, як фотаўспамін, што суправаджаецца станоўчымі ці адмоўнымі эмоцыямі, з'яўляецца спосабам самавыяўлення, характарыстыкай асобы, хобі сучаснага чалавека. Фотаздымак як сродак камунікатыўнага акта «прымушае» трымаць у памяці і прыгадваць у адпаведны момант жыццёвыя абставіны, шчаслівыя моманты або праблемы ва ўзаемаадносінах з іншымі членамі найбліжэйшага сямейнага кола.

Аналіз фотараду айчынных падручнікаў часам сведчыць пра выпадковы характар яго напаўнення. У ідэале невербальны кампанент школьных дапаможнікаў павінен выконваць сэнсавую, культуралагічную нагрузку. Набор візуальных вобразаў не павінен запаўняцца, зыходзячы з густаў складальнікаў. Візуальны імідж выдання выступае свайго роду візітоўкай для сучаснага чытача. Тым больш, што сённяшнія школьнікі ў працэсе пошуку інфармацыі найперш «сканіруюць» невербальныя звесткі.

Прачытанне свету праз фотаздымак мае на ўвазе вылучэнне вобразаў, ключавых для разумення культуры грамадства. Цэласная мадэль візуалізацыі (у тым ліку і ў школьных падручніках ) як сістэма прадстаўлення сацыяльна-гуманітарных ведаў пра свет можа трактавацца як выяўленне ідэі калектыўнай памяці, ідэнтычнасці беларусаў.

### *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*

1. ***Быстрицкая, М. А.*** Интернет-жанры как сетевой инструментарий учителя-словесника / М. А. Быстрицкая // Тексты новой природы в образовательном пространстве современной школы: материалы VIII Междунар. науч.-практ. конф. «Педагогика текста», Санкт-Петербург, 21 окт. 2016 г. / под ред. Т. Г. Галактионовой, Е. И. Казаковой. – СПб. : ЛЕМА, 2016. – С. 36–39.
2. ***Барт, Р.*** Camera lucida. Комментарий к фотографии / Р. Барт. – М. : Ад Маргинем Пресс, 2013. – 190 с.
3. ***Зонтаг, С.*** О фотографии / С. Зонтаг. – М. : Ад Маргинем Пресс, 2015. – 268 с.
4. ***Величко, А. М.*** Фотографы земли белорусской. 1850–1918 / А. М. Величко. – Минск : З. Колас, 2018. – 352 с.
5. ***Грунтоў, С. У.*** Фатаграфія і культура памяці ў беларусаў у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя: манаграфія / С. У. Грунтоў. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 189 с.
6. ***Цішчанка, І. К.*** З творчай спадчыны І. А. Сербава / І. К. Цішчанка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1974. – № 1. – С. 47–51.
7. Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава. 1911–1912 / склад., аўтар уступ. артыкула В. А. Лабачэўская; рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2012. – 455 с.
8. ***Саўчанка, Н.*** Сава Сіўко (1888–1978 гг.). Фатограф Любчанскага краю / Н. Саўчанка. – Мінск : Альтиора Форте, 2019. – 312 с.
9. Беларусы ў фотаздымках [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://history-belarus.com/pages/download/blr_types.php. – Дата доступу: 17.01.2024.
10. ***Цыдзік, У. С.*** Фотапраект «Бачу Беларусь такой» як складнік краязнаўчай работы / У. С. Цыдзік // Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі ў рамках Года малой Радзімы: зборнік матэрыялаў : у 2 т. – Т. 1. / рэдкал.: А. М. Карлюковіч (старшыня) [і інш.], Мінск, 12-13 сак. 2020 г. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2020. – С. 332.
11. Газета «Літаратура і мастацтва» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://zviazda.by/be/edition/litaratura-i-mastactva. – Дата доступу: 19.01.2024.


Паступіў у рэдакцыю 31.01.2024 г.
Кантакты: vasuk.mila@tut.by (Васюковіч Людміла Сяргееўна)

***Vasyukovich L. S.*** **PHOTOGRAPH AS TEXT IN MODERN SCHOOL EDUCATIONAL SPACE**

*Photography is examined by the author in the context of the modern format of texts, which serve as the basis for the formation of students' functional writing. The existence of photographs and other small-format texts in the educational space demonstrates an attempt to go beyond the boundaries of verbal canons of providing information.*

*The photograph does not represent a detailed message, but only the basis for dialogue. The photo becomes a support for reasoning, interpretation, memories, and full-fledged communication between interlocutors.*

**Keywords:** photograph as text, photograph as a sign of culture, photograph as a component of the educational process.